УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# АДАМОВІЧ АНТОН ЯЎСТАФ’ЕВІЧ

ЛІТАРАТУРАЗНАВЕЦ, ПРАЗАІК, КРЫТЫК

13 (26) ЧЭРВЕНЯ 1909 Г. – 12 ЧЭРВЕНЯ 1998 Г.

**ФОНД № 459**

**ВОПІС № 1**

**1912-1998, коп. за 1809 і 1909 гг.**

МІНСК 2021

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 459**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.Я. АДАМОВІЧА | 1-21 | 1-4 |
| 1.1. | ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫЯ НАРЫС, АРТЫКУЛЫ І ІНШ. | 1-4 | 1 |
| 1.2. | АПАВЯДАННІ, НАВЭЛА, НАРЫСЫ, ІМПРЭСІІ І ІНШ. | 5-13 | 1-3 |
| 1.3. | АЎТАБІЯГРАФІІ, РЭЗЮМЕ, ДЗЁННІКАВЫЯ ЗАПІСЫ І ІНШ. | 14-21 | 3-4 |
| 2. | ПЕРАПІСКА | 22-43 | 4-5 |
| 2.1. | ПІСЬМЫ А.Я. АДАМОВІЧА | 22-29 | 4 |
| 2.2. | ПІСЬМЫ А.Я. АДАМОВІЧУ | 30-43 | 4-5 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ А.Я. АДАМОВІЧА | 44-85 | 5-12 |
| 3.1. | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.Я. АДАМОВІЧА | 44-61 | 6-8 |
| 3.2. | ДАКУМЕНТЫ АБ НАВУЧАННІ А.Я. АДАМОВІЧА Ў БДУ | 62-68 | 8-9 |
| 3.3. | ДАКУМЕНТЫ ВЫКЛАДЧЫЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ А.Я. АДАМОВІЧА | 69-75 | 9-10 |
| 3.4. | ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ А.Я. АДАМОВІЧА Ў ГЕРМАНІІ І ЗША | 76-83 | 10-12 |
| 3.5. | ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЯЎ А.Я. АДАМОВІЧА | 84-85 | 12 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ ПРА І З УПАМІНАННЕМ А.Я. АДАМОВІЧА | 86-90 | 12-13 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ А.Я. АДАМОВІЧАМ ДА СВАІХ ПРАЦ І ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ | 91-97 | 13-14 |
| 6. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 98-114 | 14-16 |
| 7. | ДАКУМЕНТЫ ЧЛЕНАЎ СЯМ'І А.Я. АДАМОВІЧА | 115-118 | 16-17 |
| 8. | ДАКУМЕНТЫ А.Я. АДАМОВІЧА, ПЕРАДАДЗЕНЫЯ З НАЦЫЯНАЛЬНАГА АРХІВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У БДАМЛМ | 119-126 | 17-18 |
| 9. | СПІС КНІГ | | |

## Прадмова

**Адамовіч Антон Яўстаф'евіч** (псеўданімы Г. Альгердзіч, В. Бірыч, Д. Забранскі, Н. Недасек, Р. Склют, С. Юстапчык; крыптонім – А. Ан) нарадзіўся 13 (26) чэрвеня 1909 г. у Мінску. У 1918 г. паступіў у падрыхтоўчы клас Мінскай прыватнай гімназіі С.П. Зубакіна і К.В. Фальковіча. Праз год перавёўся і ў 1924 г. скончыў сямігадовую працоўную школу № 2 Мінска. У 1920–1922 гг. наведваў "Беларускую хатку", у 1921 г. – летнія курсы па гісторыі беларускай літаратуры прафесара Я.Ф. Карскага ў Інстытуце народнай адукацыі, быў сябрам Крывіцкай юнацкай грамады і Саюза беларускай моладзі. У 1924–1928 гг. вучыўся ў Беларускім педагагічным тэхнікуме імя Усевалада Ігнатоўскага, узначальваў універсітэцкі літаратурны гурток, у які ўваходзілі П.Ф. Глебка, С. Дарожны (С.М. Серада), М. Лужанін (А.А. Каратай), П. Трус і інш. У 1928 г. залічаны на 2-і курс літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ, далучыўся да літаратурна-мастацкага аб'ядання "Узвышша". 25 ліпеня 1930 г. арыштаваны, асуджаны на 5 гадоў ссылкі па справе "Саюза вызвалення Беларусі" і высланы ў Глазаў (Воцкая аўтаномная вобласць, Расія), дзе ў 1931–1934 гг. працаваў выкладчыкам гаспадарчага вылічэння, метэаралогіі, матэматыкі, статыстыкі і фізікі ў абласным Вучэбным камбінаце і тэхнікуме патрэбкаапераціі і Калгасна-кааператыўным тэхнікуме. У 1934 г. быў пераведзены ў Вятку (у тым жа годзе перайменаваную ў Кіраў) (Удмурцкая АССР, Расія). У 1935 г. адмысловай нарадай НКУС СССР атрымаў дадатковыя 2 гады ссылкі без тлумачэння прычыны. У 1935–1936 гг. працаваў выкладчыкам нямецкай мовы ў няпоўнай сярэдняй школе №1, у 1936–1937 гг. – у сярэдняй школе №10 імя І.С. Тургенева ў Кіраве. У 1936 г. скончыў Дзяржаўны цэнтральны інстытут завочнага навучання замежным мовам у Маскве з кваліфікацыяй "перакладчык з нямецкай мовы на рускую". У 1937 г. за два месяцы да сканчэння ссылкі арыштаваны ў Кіраве і этапіраваны ў Мінск. У 1938 г. быў вызвалены. У 1939–1941 гг. працаваў выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры ў Мінскім хіміка-тэхналагічным тэхнікуме харчовай прамысловасці. У час нямецкай акупацыі ўзначальваў выдавецкі аддзел пры Мінскай гарадской управе, працаваў рэдактарам "Беларускай газеты" і краёвага выдавецтва "Менск", уваходзіў у прэзідыум Беларускага навуковага таварыства, з'яўляўся сябрам Галоўнай рады Беларускай народнай самапомачы, рэферэнтам па справах прапаганды і прэсы пры Генеральным камісарыяце "Беларусь". Увосень 1943 г. пераехаў у Берлін, у [1944 г.] – у Фрэйбург, у 1945–1950 гг. працаваў выкладчыкам англійскай, беларускай і нямецкай моў і гісторыі ў Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў Рэгенсбургу (Германія). З 1946 г. быў сябрам-заснавальнікам Крывіцкага навуковага таварыства Пранціша Скарыны, з 1949 г. – яго сакратаром, у 1949 г. абраны радным і міністрам прэсы і інфармацыі Ураду БНР, з 1950 г. стаў сябрам Асацыяцыі свабоднай прэсы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Балтыйскіх і Балканскіх краін. Выдаваў газеты і часопісы "Бацькаўшчына", "Ведамкі", "Конадні" і "Сакавік". У 1950 г. пераехаў у ЗША. У 1950 г. стаў сябрам

Беларуска-амерыканскага задзіночання, у 1951 г. – Міжнароднай акадэміі свабоднай навукі і літаратуры (Académie International Libre des Sciences et des Lettres) (Францыя), у 1955 г. – Беларускага інстытута навукі і мастацтва (ЗША). У 1953–1957 гг. працаваў у Інстытуце па вывучэнні гісторыі і культуры СССР у Мюнхене, у 1960-х – 1970-х гг. – у беларускай і рускай рэдакцыях "Радыё Свабода" ў Нью-Ёрку, з 1980-х гг. – быў на творчай працы.

Першая друкаваная праца А.Я. Адамовіча – рэцэнзія на зборнік Валерыя Маракова "Пялёсткі" (газета "Беларуская вёска", 1925). Найбольш вядомыя яго працы: "Максім Гарэцкі" (часопіс "Узвышша", 1928), рэцэнзіі на кнігі Н.А. Арсенневай "Сягоння" (1944), зборнік А. Салаўя "Звіняць званы Святой Сафіі" (1947) і інш., прадмовы да эміграцкіх выданняў У.М. Дубоўкі "Credo" (1949), Я. Коласа "Новая зямля" (1952), У.А. Жылкі "Творы. Да 20-годдзя ўгодкаў смерці" (1953), А. Мрыя "Запіскі Самсона Самасуя" (1953) і інш., шматлікія аповесці, нарысы, "зацемкі" і інш.

А.Я. Адамовіч памёр 12 чэрвеня 1998 г. Пахаваны на могілках парафіі Святой Жыровіцкай Божай Маці ў Нью-Брансуіку (ЗША).

Дакументы А.Я. Адамовіча былі выяўлены ў 1951 г. у фондзе "Генеральнага камісарыята Беларусі" Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР (цяпер – Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь) і вылучаны ў асобны фонд "Беларускага буржуазнага нацыяналіста Адамовіча". У 2005 г. па ініцыятыве дырэктара БДАМЛМ Г.В. Запартыка дакументы А.Я. Адамовіча (7 спраў за 1935–1943 гг.), як профільныя, былі перададзены з НАРБ у БДАМЛМ[1]. У 2010–2018 гг. другая частка дакументаў А.Я. Адамовіча паступіла з БІНіМа ў Нью-Ёрку ад даследчыка беларускай эміграцыі Лявона Юрэвіча (4 з іх – праз літаратуразнаўцу і перакладчыка Ц.В. Чарнякевіча). У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 126 спраў (923 дак.) за 1912–1998, коп. за 1809 і 1909 гг.

Вопіс складаецца з 8 раздзелаў:

У першым раздзеле "Творчыя дакументы А.Я. Адамовіча" змешчаны 3 падраздзелы, справы ў якіх сфарміраваны па жанрах і храналогіі за 1941–1976 гг. Першы падраздзел прадстаўлены літаратуразнаўчымі нарысам, артыкуламі і інш., другі – апавяданнямі, навэлай, нарысамі, "зацемкамі" і інш., трэці – аўтабіяграфіямі, рэзюме, дзённікавымі запісамі і інш.

У другім раздзеле – "Перапіска" – справы сістэматызаваны па алфавіце карэспандэнтаў і адрасатаў А.Я. Адамовіча, унутры спраў – па храналогіі ([да чэрвеня 1941 г.] – 1985).

Трэці раздзел – "Дакументы да біяграфіі А.Я. Адамовіча" – складаецца з 5 падраздзелаў: асабістыя дакументы А.Я. Адамовіча, дакументы аб яго

---

[1] Падрабязна аб гэтым: Г. Запартыка "Асабісты архіўны фонд Антона Адамовіча ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва". // Пра час "Узвышша": матэрыялы Узвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2008–2010). Вып. 5 / уклад. Г.В. Запартыка, В.В. Жыбуль, У.Г. Кулажанка, нав. рэд. М.І. Мушынскі. – Мінск: РІВШ, 2011: 194–201.

навучанні ў БДУ, дакументы яго выкладчыцкай дзейнасці, дакументы аб працы А.Я. Адамовіча ў Германіі і ЗША і дакументы да юбілеяў А.Я. Адамовіча. Некаторыя з гэтых дакументаў (даведка аб нараджэнні (Спр. 44), пасведчанне аб рэгістрацыі ў Вільні (Спр. 50) і інш.) разыходзяцца з афіцыйнай біяграфіяй А.Я. Адамовіча. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе (1918–1993 гг., коп. за 1909 г.).

У чацьвёртым раздзеле – "Дакументы пра і з упамінаннем А.Я. Адамовіча" – справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе (1941–1998).

Пяты раздзел – "Дакументы, сабраныя А.Я. Адамовічам да сваіх прац і па цікавых для яго тэмах" – змяшчае справы. Сістэматызаваныя па жанравым прынцыпе, а ўнутры спраў – па алфавіце аўтараў твораў (1918–[1983], коп. за 1809 г.).

Шосты раздзел – "Выяўленчыя дакументы" – прадстаўлены фатагарафіямі А.Я. Адамовіча і яго пахавання, фатаграфіямі сяброў і знаёмых А.Я. Адамовіча і інш. (1912–1998).

У сёмым раздзеле – "Дакументы членаў сям'і А.Я. Адамовіча" – сабраны дакументы бацькоў А.Я. Адамовіча – А.і П. Івашкевічаў, фатаграфіі Н.А. Шыляевай (жонкі) і інш. Справы сістэматызаваны па храналагічным прынцыпе ([пач. XX ст.] – 1959).

Восьмы раздзел – "Дакументы А.Я. Адамовіча, перададзеныя з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь у БДАМЛМ" – прадстаўлены 7 справамі, сістэматызаванымі ў НАРБ, і вопісам НАРБ на гэтыя дакументы (1935–1943).

Прадмову склала
Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава
22.06.2021

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ФОНД № 459
ВОПІС № 1
1912-1998, коп. за 1809 і 1909

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 21.10.2021
№ 10

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|

## 1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.Я. АДАМОВІЧА

### 1.1. ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫЯ НАРЫС, АРТЫКУЛЫ І ІНШ.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | "Па дарозе да Эўропы (кароткі нарыс развіцця беларускай літаратуры)".<br>Сшытак з аўтографам | 1943 | 9 | 1 | |

* * *

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2 | "Byelorussian Writers on the North American Continent" ("Беларускія пісьменнікі на Паўночнаамерыканскім кантыненце"), "На нівах і ўзвышшах беларускага слова", "The Journal Kryvic" ("Часопіс Крывіч") і інш. Артыкулы (на англійскай і беларускай мовах).<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай, машынапіс | 1944-1973 | 106 | 8 | |
| 3 | Літаратуразнаўчы артыкул, прысвечаны развіццю беларускай літаратуры п.п. XX ст.<br>Чарнавы аўтограф | [1950-я гг.] | 36 | 1 | |

* * *

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4 | Рэцэнзія А.Я. Адамовіча на паэму Лявона Случчаніна (Лявона Шпакоўскага) "Рагнеда" і інш.<br>Чарнавы аўтограф.<br>Адказы А.Я. Адамовіча на заўвагі неўстаноўленай асобы да яго рукапісу "Оппозиционные течения в белорусской литературе" і інш.<br>Чарнавы аўтограф | 1944 - [1970-я гг.] | 12 | 4 | |

### 1.2. АПАВЯДАННІ, НАВЭЛА, НАРЫСЫ, ІМПРЭСІІ І ІНШ.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 5 | "Каханы горад". Апавяданне.<br>Чарнавы аўтограф.<br>На адвароце Лл. 5-10, 12 змешчаны вершы Алеся Каханоўскага "І ня згаснуць мне зоры...", "Цьвітуць ліпы" і інш. (4) (аўтограф аўтара) (1943) | 1943 | 23 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 6 | "Каханы горад (Завязка раману)". Друкаванае выданне (Остэрхофэн: выд-ва "Сакавік") | 1948 | 42 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | "Спробная трывога". Апавяданне. Чарнавы аўтограф | [1943] | 46 | 1 | |
| 8 | "Галіна-Мальвіна", "Ліставія", "Перайшоўшы вуліцу" і інш. Апавяданні і фрагменты апавяданняў. Чарнавы аўтограф | [др. пал. 1940-х гг.] - 1948 | 36 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 9 | "Кароткі нарыс дачыненьняў бальшавізму ды крывічоў ("беларусаў")", "Палітыка правакацыі й разгону Крывіі (Беларусі). Кароткі нарыс дачыненьняў між бальшавізмам і беларушчынай" і інш. Нарысы. Машынапіс | 1944-1946 | 36 | 3 | |
| 10 | "1917-1947 (Да трыццатых угодкаў найвызначнейшых падзеяў нашага нацыянальнага руху)" і "1918-1948 (Да трыццатых угодкаў найвызначнейшых падзеяў нашага нацыянальнага руху)". Гістарычныя нарысы. Друкаваныя выданні (Остэрхофэн: выд-ва "Бацькаўшчына") | 1947, 1948 | 23 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 11 | "Несантымэнтальнае падарожжа". Імпрэсія. Выразкі з "Беларускай газеты" | 1942 | 6 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 12 | "Крыху каля рызаў і падрызьнікаў", "сьвятароў" і "цемняроў" (Зацемкі ўкваленага філёлёга)", "Паўстаньне правадыра з народу нашага... (Думкі, развагі, зацемкі, зарысоўкі)" і інш. "Зацемкі". Чарнавы аўтограф. "Не кладзеце пальца ў рот! (Памфлет старога "ворага народу")". Чарнавы аўтограф | 1944 - [1950-я гг.] | 33 | 15 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | "Адрыс маю новы...", "Тэатр", "Чужое гора" і інш. Вершы і накіды вершаў. Чарнавы аўтограф, аўтограф, машынапіс | 1944-1953 | 17 | 19 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1.3. АЎТАБІЯГРАФІІ, РЭЗЮМЕ, ДЗЁННІКАВЫЯ ЗАПІСЫ І ІНШ.** | | | | |
| 14 | "Мой счёт им (жизнеописание одного из "осчастливленных" большевистским "раем")". Аўтабіяграфія за 1909-1938 гг. з упамінаннем А.А. Бабарэкі, У.М. Дубоўкі, У.А. Жылкі, У.М. Ігнатоўскага, нам. заг. друку ЦК ВКП(б) П.М. Кержанцава, Т.Т. Кляшторнага, Я. Купалы, Я.Ю. Лёсіка, праф. М.М. Піятуховіча, Я. Пушчы (І.П. Плашчынскага), П. Труса і інш., літаратурных аб'яднанняў "Маладняк" і "Узвышша", справы "Саюза вызвалення Беларусі" і інш. Сшытак з аўтографам і ўстаўкай | 1941 | 31 | 1 | |
| 15 | Аўтабіяграфіі, рэзюме і інш. А.Я. Адамовіча (на англійскай, беларускай і нямецкай мовах). Аўтограф, машынапіс | [1948]-1958 | 29 | 14 | |
| 16 | "Лірнік краіны ветлай (з успамінаў пра Міколу Равенскага)". Чарнавы аўтограф | 1963 | 7 | 1 | |
| 17 | Дзённікавыя запісы А.Я. Адамовіча. Сшытак з аўтографам | 1976 | 112 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 18 | Э. Грубэр, Г. Груні[н]гер. "Юлечка". П'еса. У перакладзе А.Я. Адамовіча з нямецкай мовы на беларускую для Мінскага гарадскога тэатра. Сшытак з чарнавым аўтографам перакладчыка | 1943 | 46 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 19 | М. Кавыль. "Цяжкія думы (Вянок санэтаў)". Машынапіс з рэдактарскай праўкай А.Я. Адамовіча | 1956 | 17 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 20 | Разрозненныя лісты з фрагментамі тэкстаў і запісаў А.Я. Адамовіча. Чарнавы аўтограф | 1941 - [пасля 1967 г.] | 73 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 21 | Аўтабібліяграфія А.Я. Адамовіча за 1927-1948 гг. Аўтограф | [1948] | 1 | 1 | |
| | **2. ПЕРАПІСКА** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **2.1. ПІСЬМЫ А.Я. АДАМОВІЧА** | | | | |
| 22 | Пісьмы да М. Абрамчыка (Францыя) | 1957, 1967 | 5 | 2 | |
| 23 | Пісьмы да Н.А. Арсенневай (Беларусь, Германія) | 1944-1945 | 54 | 17 | |
| 24 | Паштоўкі да Ю. Віцьбіча (Юрыя Стукаліча) (2) і пісьмо да В. Тумаша (Германія) | [пасля 1946 г.] - 1949 | 4 | 3 | |
| 25 | Пісьмы да М. Кавыля (Язэпа Лешчанкі) (7) і В. Кендыша (ЗША) | 1955-1967 | 13 | 8 | |
| 26 | Пісьмы да А. Федаровіч і неўстаноўленай асобы (Беларусь) | [да чэрвеня 1941 г.], 1944 | 3 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 27 | Пісьмо да А. Івашкевіча (айчыма) (ЗША) | 1963 | 1 | 1 | |
| 28 | Пісьмы са зваротам "Дарагі сябру!" (2) і інш. (Германія, ЗША) | 1949 - [1950-я гг.] | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 29 | Пачатак пісьма А.Я. Адамовіча ў Адміністрацыю дапамогі і аднаўлення ААН з тлумачэннем немагчымасці аб'яднання [ў справаздачах ААН] беларускай нацыянальнай групы з грэчаскай праваслаўнай групай (на англійскай мове) | 1946 | 1 | 1 | |
| | **2.2. ПІСЬМЫ А.Я. АДАМОВІЧУ** | | | | |
| 30 | Пісьмы Л. Акіншэвіча (2), Я. Вярбіцкага, А. Маліцкага, В. Пануцэвіча і інш. да А.Я. Адамовіча (на беларускай і ўкраінскай мовах) (ЗША).<br>Да пісьма Я. Вярбіцкага прыкладзена яго візітная картка. Л. 6 | 1956-1982 | 12 | 7 | |
| 31 | Паштоўкі і пісьмы Я. Арцюха, С. Грынкевіча і М. Тулейкі (2) і інш. да А.Я. Адамовіча (ЗША).<br>Канверты ад пісьмаў К. Мерляка (2) да А.Я. Адамовіча (ЗША) | 1952-1958 | 9 | 7 | |
| 32 | Паштоўкі і пісьмы У. Глыбіннага (Уладзіміра Сядуры) і М. Кавыля (Язэпа Лешчанкі) (3) да А.Я. Адамовіча (ЗША) | 1956-1982 | 10 | 4 | |
| 33 | Пісьмы А. Зноскі і У. Рымшы ў рэдакцыю газеты "Раніца" з заўвагамі да публікацыі А.Я. Адамовіча "Крыху каля рызаў..." і адказы А.Я. Адамовіча на іх (Германія) | 1944 | 5 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 34 | Пісьмы М. Казіміровіча, А. Надсана, Ч. Сіповіча да А.Я. Адамовіча (Вялікабрытанія) | [1948] - 1981 | 4 | 3 | |
| 35 | Пісьмы В. Кендыша (2) і Ф. Чарняўскага (2) да А.Я. Адамовіча (ЗША) | 1958 | 13 | 4 | |
| 36 | Віншавальная паштоўка ад В. і М. Пашкевічаў А.Я. Адамовічу (Канада) | 1979 | 2 | 1 | |
| 37 | Паштоўкі і пісьмы А. Салаўя (Альберта Кадняка), яго ўдавы З. Кадняк (11) і М. Скабея да А.Я. Адамовіча (Аўстралія) | 1957-1983 | 35 | 13 | |
| 38 | Пісьмо В. Сянкевіча да А.Я. Адамовіча (Іспанія) | 1981 | 2 | 1 | |
| 39 | Пісьмо Ю. Туронка да А.Я. Адамовіча (Польшча) | 1985 | 1 | 1 | |
| 40 | Пісьмы Л. Урбан (6), П. Урбана (3) і інш. да А.Я. Адамовіча (Германія). Два пісьмы П. Урбана высланы з адпачынку ў Італіі.<br><br>Канверт ад пісьма У. Цвіркі да А.Я. Адамовіча (Германія) | 1963 - [1980-я гг.] | 25 | 11 | |
| | * * * | | | | |
| 41 | Пісьмы А. Івашкевіча (айчыма) да А.Я. Адамовіча (ЗША) | 1963 | 7 | 7 | |
| | * * * | | | | |
| 42 | Пісьмо Згуртавання беларусаў у Манрэалі да А.Я. Адамовіча з удакладненнем дэталяў яго прыезду (Канада) | 1956 | 1 | 1 | |
| 43 | Пісьмо Міжнароднай акадэміі свабоднай навукі і літаратуры да А.Я. Адамовіча аб абранні яго паўнапраўным сябрам (на французскай мове) (Францыя) | 1951 | 1 | 1 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ А.Я. АДАМОВІЧА** | | | | |
| | **3.1. АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.Я. АДАМОВІЧА** | | | | |
| 44 | Даведка аб нараджэнні А.Я. Адамовіча 13 мая 1909 г.<br>Натарыяльна завераная копія 1928 г.<br>Фрагмент дакумента з пячаткай Мінскага гарадскога бюро ЗАГС ад 29 жніўня 1940 г. | | 2 | 2 | |
| 45 | Пасведчанне Мінскай прыватнай з правамі ўрадавай гімназіі С.П. Зубакіна і К.В. Фальковіча аб | | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | залічэнні А.Я. Адамовіча вучнем старшага падрыхтоўчага класа (1918).<br>Натарыяльна завераная копія.<br>Пасведчанне Мінскага інстытута народнай адукацыі<br><br>аб наведванні А.Я. Адамовічам курсаў "Гісторыя старай беларускай пісьменнасці" і "Гісторыя новай беларускай літаратуры" прафесара Я.Ф. Карскага (1921).<br>Копія | | | | |
| 46 | Дакументы аб навучанні А.Я. Адамовіча ў сямігадовай працоўнай школе № 2 Мінска (арыгінал і рукапісныя копіі пасведчання аб заканчэнні, залікoвы ліст і інш.) | 1924 | 5 | 5 | |
| 47 | Атэстат і характарыстыкі выпускніка Мінскага дзяржаўнага педагагічнага тэхнікума А.Я. Адамовіча.<br>Натарыяльна завераныя і незавераныя копіі | 1928 | 4 | 4 | |
| 48 | Дакументы аб навучанні А.Я. Адамовіча на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта БДУ (натарыяльна завераныя копіі лекцыйнай кніжкі (1929), пасведчання аб адпачынку студэнта (1929), дыплома аб сканчэнні ўніверсітэта [1932] і (1939) і інш.) | | 8 | 8 | |
| 49 | Членскі білет прафсаюза работнікаў асветы БССР на імя А.Я. Адамовіча.<br>Натарыяльна завераная копія | 1931 | 1 | 1 | |
| 50 | Пасведчанне аб рэгістрацыі А.Я. Адамовіча ў Вільні (на польскай мове) | 1936 | 1 | 1 | |
| 51 | Пасведчанне Цэнтральнага інстытута завочнага навучання замежным мовам (Масква) аб атрыманні А.Я. Адамовічам звання "перакладчык вышэйшай кваліфікацыі з нямецкай мовы на рускую" і яго натарыяльна завераная копія (1937) (Расія).<br>Сертыфікат Міжнароднай арганізацыі бежанцаў аб прысваенні А.Я. Адамовічу кваліфікацыі "выкладчык сярэдняй школы" і яго завераныя копіі (на англійскай мове) (1950) і інш. (Германія) | | 6 | 6 | |
| 52 | Даведка аб вызваленні А.Я. Адамовіча, выдадзеная Упраўленнем Дзяржбяспекі НКУС БССР | 1938 | 1 | 1 | |
| 53 | Пасведчанні сябра Міжнароднага скаўцкага бюро, Юнацкай хрысціянскай асацыяцыі (Young Men's | 1945-1951 | 12 | 7 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Christian Association) і інш. на імя А.Я. Адамовіча (на англійскай і нямецкай мовах) (Германія). Сяброўская кніжка Беларуска-амерыканскага задзіночання, сяброўская картка Руска-амерыканскага саюза для абароны і дапамогі рускім і інш. на імя А.Я. Адамовіча (на англійскай мове) (ЗША) | | | | |
| 54 | Падатковая картка А.Я. Адамовіча на 1948 г. (на нямецкай мове) (Германія). Сертыфікаты "Вестсайдскай федэральнай пазыкова-ашчаднай асацыяцыі ў Нью-Ёрку" і інш. на імя А.Я. Адамовіча (на англійскай мове) (ЗША) | 1948-1986 | 12 | 4 | |
| 55 | Пасведчанні А.Я. Адамовіча - міністра прэсы і інфармацыі Ураду БНР - за подпісамі прэм'ер-міністра Аўгена Каханоўскага (Аўгена Калубовіча) і сакратара Гіпаліта Паланевіча (на англійскай і беларускай мовах). "Кніжачка беларускага эмігранта" на імя А.Я. Адамовіча за подпісам Лявона Рыдлеўскага (з фіскальнымі маркамі БНР) | 1949-1951 | 13 | 3 | |
| 56 | Пасведчанні аб працы А.Я. Адамовіча выкладчыкам англійскай і нямецкай моў і гісторыі ў Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў 1945-1950 гг. (на англійскай мове) (Германія) | 1950 | 2 | 2 | |
| 57 | Пасведчанне рэдактара газеты "Бацькаўшчына" і сябра Асацыяцыі свабоднай прэсы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Балтыйскіх і Балканскіх краін на імя А.Я. Адамовіча на 1950-1951 гг. (на англійскай, іспанскай, нямецкай і французскай мовах) (Германія) | | 5 | 1 | |
| 58 | Сертыфікат аб натуралізацыі і пашпарты грамадзяніна ЗША (4) на імя А.Я. Адамовіча | 1956-1993 | 32 | 5 | |
| 59 | Натарыяльна завераны тэстамент А.Я. Адамовіча (на англійскай мове) (ЗША) | 1972 | 4 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 60 | Запрашэнне ўправы Беларускай бібліятэкі і музея імя Францыска Скарыны на імя А.Я. Адамовіча на святкаванне 10-годдзя адкрыцця бібліятэкі (Вялікабрытанія). Запрашэнні і інш. Беларуска-амерыканскага задзіночання, Беларускай студэнцкай асацыяцыі, прэзідыума і сектара Рады БНР (4) на імя А.Я. Адамовіча на з'езд і сходы і Украінскай | 1952-1981 | 12 | 10 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | акадэміі ў Нью-Ёрку на лекцыю Ю. Ліхтэна (на англійскай і беларускай мовах) (ЗША) | | | | |
| 61 | Запрашэнне на прыватны прыём Прэзыдэнта ЗША Джорджа Буша (старэйшага) і старшыні Нацыянальнага рэспубліканскага камітэта Кангрэса ЗША Гая Вандэра Джагта ў Белы дом на імя А.Я. Адамовіча і запрашальная картка [сябра] Рэспубліканскага лідэрскага савета Кангрэса ЗША (The Republican Congressional Leadership Council) на гэта мерапрыемства (на англійскай мове) | 1989 | 3 | 2 | |
| | **3.2. ДАКУМЕНТЫ АБ НАВУЧАННІ А.Я. АДАМОВІЧА Ў БДУ** | | | | |
| 62 | Канспект лекцый А.Я. Адамовіча па прадмеце "Беларускі фальклор" (праф. М.М. Піятуховіч), наведаных у час навучання ў БДУ.<br>2 сшыткі з аўтографам | 1928 | 24 | 1 | |
| 63 | Пачатак канспекта лекцый А.Я. Адамовіча па прадмеце "Гісторыя Захада" (дац. Е.І. Рыўлін) і яго запісы да семінарскага занятку "А.С. Пушкін" па прадмеце "Паэтыка" (праф. Я.І. Барычэўскі), наведаных у час навучання ў БДУ.<br>Сшытак з аўтографам | 1928-1929 | 5 | 2 | |
| 64 | Канспект лекцый А.Я. Адамовіча па прадмеце "Метадалогія літаратуразнаўства" (дац. Гальперына), наведаных у час навучання ў БДУ.<br>Сшытак з аўтографам | 1929-1930 | 12 | 1 | |
| 65 | Канспект лекцый А.Я. Адамовіча па прадмеце "Уводзіны ў мастацтвазнаўства" (дац. В. Бухаркін), наведаных у час навучання ў БДУ.<br>2 сшыткі з аўтографам | [1929] | 21 | 1 | |
| 66 | [Запісы А.Я. Адамовіча да семінарскіх заняткаў у БДУ] і інш.<br>Рукапіс.<br>На адваротным баку Л. 36 - верш А.Я. Адамовіча "Столькі сьлёз..." (аўтограф) | [1928-1930] | 47 | 21 | |
| 67 | Спісы прысутных на семінарскіх занятках па прадмеце "Беларускі фальклор" (праф. М.М. Піятуховіч) у БДУ з аўтографамі А.Я. Адамовіча, Наталлі Вішнеўскай, Пятра Глебкі, Антона Змачынскага, Віктара Казлоўскага, Аляксандра Каратая (Максіма Лужаніна), Марка Карповіча, Ахрэма Катановіча, Тодара Кляшторнага, Змітрака Паваротнага, Аляксандра Пальчыка, Веры Рэвэлі, | 1928-[1929] | 8 | 9 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Паўлюка Труса, Сяргея Серады (Сяргея Дарожнага), Кандрата Сяледчыка і інш., з упамінаннем Пятра Звонака (Алеся Звонака) і інш.<br>Рукапіс А.Я. Адамовіча | | | | |
| 68 | Спісы прысутных на семінарскіх занятках па прадмеце "Паэтыка" (праф. Я.І. Барычэўскі) у БДУ з аўтографамі А.Я. Адамовіча, Наталлі Вішнеўскай, Пятра Глебкі, Віктара Казлоўскага, Аляксандра Каратая (Максіма Лужаніна), Марка Карпачова, Змітрака Паваротнага, Язэпа Падабеда, Аляксандра Пальчыка, Веры Рэвэлі, Сяргея Серады (Сяргея Дарожнага), Кандрата Сяледчыка і інш., з упамінаннем Пятра Звонака (Алеся Звонака), Тодара Кляшторнага і інш.<br>Рукапіс А.Я. Адамовіча.<br>З адваротнага боку Л. 5 - спіс прысутных на семінарскім занятку па прадмету "Беларускі фальклор" (праф. М.М. Піятуховіча) | 1928-1929 | 12 | 17 | |
| | **3.3. ДАКУМЕНТЫ ВЫКЛАДЧЫЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ А.Я. АДАМОВІЧА** | | | | |
| 69 | Даведкі, пасведчанні і водгук аб працы А.Я. Адамовіча - выкладчыка гаспадарчага вылічэння, матэматыкі, статыстыкі і фізікі ў абласным вучэбным камбінаце і тэхнікуме Патрэбкааперацыі і калгасна-кааператыўным тэхнікуме ў 1931-1934 гг. у Глазаве (Расія).<br>Арыгіналы і натарыяльна завераныя копіі | 1932-1937 | 12 | 10 | |
| | * * * | | | | |
| 70 | Даведкі аб працы і характарыстыка на А.Я. Адамовіча - выкладчыка нямецкай мовы няпоўнай сярэдняй школы № 1 і сярэдняй школы № 10 імя І.С. Тургенева ў 1935-1937 гг. у Кіраве (Расія).<br>Арыгіналы і натарыяльна завераныя копіі | 1936-1939 | 6 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 71 | Плакат-"падзяка" вучняў 7 "В" класа няпоўнай сярэдняй школы № 1 Кірава настаўніку А.Я. Адамовічу і пейзажы (2) вучаніцы Махавай.<br>Папера, акварэль, аловак, [гуаш].<br>"Прощанье с А.Е. Адамовичем". Верш вучня Н. Папкова.<br>Аўтограф | 1936 | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 72 | Характарыстыка на А.Я. Адамовіча - выкладчыка беларускай мовы Мінскага хіміка-тэхналагічнага тэхнікума харчовай прамысловасці - і лісток непрацаздольнасці А.Я. Адамовіча | 1939, 1941 | 2 | 2 | |
| 73 | Канспект-аналіз А.Я. Адамовіча па твору П.У. Броўкі "Кацярына" да ўрокаў па беларускай літаратуры ў Мінскім хіміка-тэхналагічным тэхнікуме.<br>Сшытак з аўтографам.<br>Сшыткі па прадмеце "Беларуская літаратура" вучняў А.Я. Адамовіча | 1940-<br>[да 1941 г.] | 24 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 74 | Лекцыі па прадметах "Беларуская літаратура XIX ст." і "Тэорыя літаратуры", прачытаных А.Я. Адамовічам у Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы (Германія), і інш.<br>Аўтограф | [1945-1950] | 33 | 6 | |
| 75 | Лекцыі па прадмеце "Гісторыя Беларусі" для VII і VIII класаў, прачытаных А.Я. Адамовічам у Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы (Германія).<br>Аўтограф | [1945-1950] | 19 | 17 | |
| | **3.4. ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ А.Я. АДАМОВІЧА Ў ГЕРМАНІІ І ЗША** | | | | |
| 76 | Дакументы аб працы А.Я. Адамовіча ў Германіі ў 1943-1957 гг. (прызначэнні на працу, страхавая картка працаўніка, даведкі аб працы і інш.) (на англійскай і нямецкай мовах).<br>Часовае пасведчанне асобы на імя А.Я. Адамовіча (на нямецкай мове) (Германія) | 1943-1972 | 10 | 8 | |
| | * * * | | | | |
| 77 | Пасведчанні аб працы ў газеце "Бацькаўшчына", выпісаныя А.Я. Адамовічам (галоўным рэдактарам) Уладзіміру Бортніку, Леаніду Галяку, Язэпу Гуткоўскаму, Янку Кісялю, Аляксандру Мяцеліцы, Міколу Панькову, Кастусю [Птаху-]Якубу і інш. (на беларускай і нямецкай мовах) (Германія) | 1947-1948 | 11 | 11 | |
| 78 | Пісьмы галоўнага рэдактара газеты "Бацькаўшчына" і часопіса "Сакавік" А.Я. Адамовіча ў рэдакцыі газеты "Im Ausland" і часопісаў "Kronika" і "Lech" з просьбай змясціць артыкул да 30-годдзя абвяшчэння БНР і ў камандны пост АРО-225 амерыканскай арміі S-5 па пытанні высылкі ім | 1948 | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | нумароў "Бацькаўшчыны" і "Сакавіка" (на англійскай, нямецкай і польскай мовах) (Германія) | | | | |
| | * * * | | | | |
| 79 | Дэкларацыі аб працоўнай занятасці А.Я. Адамовіча і інш. для Міжнароднай арганізацыі па справах бежанцаў (на англійскай мове) (Германія) | 1948-1950 | 6 | 6 | |
| 80 | Дакументы аб пераездзе А.Я. Адамовіча ў ЗША (чарнавік запоўненай А.Я. Адамовічам анкеты падрыхтоўчай камісіі Міжнароднай арганізацыі па справах бежанцаў, пісьмы Польскага іміграцыйнага камітэта (2) і інш. па пытанні пераезду А.Я. Адамовіча і інш.) (на англійскай, нямецкай і польскай мовах) | 1948-1950 | 7 | 6 | |
| 81 | Дакументы аб працы А.Я. Адамовіча на "Радыё Свабода" ў Нью-Ёрку (справаздачы (2) і пісьмо з нью-ёркскага аддзялення "Радыё Свабода" па пытанні павышэння па пасадзе А.Я. Адамовіча) (на англійскай мове) (ЗША) | 1965-1972 | 4 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 82 | Абвестка БІНіМа ў Нью-Ёрку аб чытанні А.Я. Адамовічам рэферата "Перыядычны друк як гадавальнік беларускае літаратуры (да ўгодак "Нашай Долі", "Нашае Нівы" і "Узвышша")". Машынапіс | 1976 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 83 | Дакументы аб праходжанні А.Я. Адамовічам вакцынацыі, наведванні ўрача і інш. (на англійскай і нямецкай мовах) (Германія) | 1945-1950 | 7 | 7 | |
| | **3.5. ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЯЎ А.Я. АДАМОВІЧА** | | | | |
| 84 | "Нас тут сабралася хай мала...", "У дзень урачысты". Вершы неўстаноўленых аўтараў да 50-годдзя з дня нараджэння А.Я. Адамовіча і да дня яго нараджэння. Аўтограф неўстаноўленай асобы, машынапіс з праўкай [А.Я. Адамовіча] | 1959, 1981 | 2 | 2 | |
| 85 | Віншавальная паштоўка і пісьмо А. Калодкі і М. Скабея А.Я. Адамовічу з 70-годдзем з дня яго нараджэння (Аўстралія). Віншавальныя пісьмы сяброў Галоўнай управы Згуртавання беларусаў Вялікай Брытаніі і Ч. Сіповіча А.Я. Адамовічу з 70-годдзем з дня яго | 1979 | 12 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | нараджэння (Вялікабрытанія).<br>Віншавальная паштоўка за подпісамі грамадскіх дзеячаў Я. Запрудніка, Я. Каханоўскай, З. Кіпель, В. Тумаша і інш. А.Я. Адамовічу з 70-годдзем з дня яго нараджэння (на англійскай, беларускай, польскай, рускай і ўкраінскай мовах) (ЗША) | | | | |

**4. ДАКУМЕНТЫ ПРА І З УПАМІНАННЕМ А.Я. АДАМОВІЧА**

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 86 | Запіска В. Тумаша неўстаноўленай асобе (Беларусь) і пісьмо за подпісам А.Ш. Поп[...] "Дорогому Яну" (ЗША) з упамінаннем А.Я. Адамовіча.<br>Пісьмо рэдактара газеты "Бацькаўшчына" Станіслава Станкевіча (Германія) прэзідэнту Рады БНР Міколу Абрамчыку (Францыя) (копіі - У. Бортніку, С. Кабышу, П. Сычу, Ю. Сянькоўскаму, П. Урбану і У. Цвірку) (Германія) з паведамленнем аб спыненні сваёй працы ў газеце.<br>З пазнакай: "Копія сп. Ант. Адамовічу" | 1941-1961 | 3 | 3 | |
| 87 | Запрашэнне сябру Беларуска-амерыканскага задзіночання Аляксандру Івашкевічу (айчыму) на надзвычайны агульны сход сяброў акругі Нью-Ёрк.<br>З дапіскай: "Передаю мой голас сыну майму Антону Адамовічу" | 1964 | 1 | 1 | |

* * *

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 88 | Пасведчанне Дэпартамента здароўя Нью-Ёрка аб смерці А.Я. Адамовіча (на англійскай мове).<br>Спіс прысутных на пахаванні А.Я. Адамовіча з аўтографамі Янкі Запрудніка, Язэпа Лешчанкі (Міхася Кавыля), Міхася Сенькі, Льва Стагановіча, Васіля Шчэцькі і інш.<br>Памінальныя карткі ("клепсідры") А.Я. Адамовіча (9) | 1998 | 11 | 11 | |
| 89 | В. Шчэцька. "Na paminkach praf. Antona Adamovica". Аўтарызаваны машынапіс | 1998 | 2 | 1 | |
| 90 | Суправаджальныя пісьмы Юзэфы Найдзюк (Брэчкі), Язэпа Сажыча і інш. Янку Запрудніку да ахвяраванняў на надмагільны помнік А.Я. Адамовічу (ЗША) | 1998 | 3 | 3 | |

**5. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ А.Я. АДАМОВІЧАМ ДА СВАІХ ПРАЦ І ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ**

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 91 | Газета "Чырвоны шлях", №№ 3-4 (няпоўны), №№ 5-6 (няпоўны) і №№ 7-8 (няпоўны) за 1918 г.<br>З запісам алоўкам на кожным асобніку: "З кніжок Антося Адамовіча" і падкрэсленымі | | 45 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | А.Я. Адамовічам фрагментамі публікацый | | | | |
| 92 | "Крыніца. Літаратурна-мастацкі часопіс літгуртка МенБПТ" № 1 (4) за 1929-1930 навучальны год пад рэдакцыяй К.П. Вашыны (Лукаша Калюгі), С.І. Ліхадзіеўскага, Л. Маракова і Ю. Таўбіна. З аўтографам уладальніка - Франца Гінтаўта. | | 19 | 1 | |
| 93 | М.А. Багдановіч. "Вийшов з хати...". Верш у перакладзе М.А. Драй-Хмары з беларускай мовы на ўкраінскую (1929). Рукапіс А.Я. Адамовіча. Я. Баршчэўскі. "Ах, чым-жа твая, дзеванька, галоўка занята?" (1809), Л.А. Геніюш. "Вышыла восень" і інш. (1941-[1947]), С. Дарожны (С.М. Серада). "У трынаццаты рэйс" (1929), Ц. Залівака (С. Гайка). "... Раней сканала маці" (1931). Вершы. Рукапіс [А.Я. Адамовіча], аўтограф [Ц. Залівакі] і інш., машынапіс, выразка з друкаванага выдання | | 9 | 9 | |
| 94 | Выпіскі беларускіх слоў і выразаў, зробленыя А.Я. Адамовічам з прац І.В. Воўка-Левановіча "Важнейшыя рысы гаворкі вёскі Татаркавічы і гаворак аколічных вёсак" (1928), У.М.Ператца "Адшуканні і нагляданні ў беларускай народнай традыцыі" (1928), П.А. Растаргуева "Да характарыстыкі беларускі гаворак" (1928) і інш. Сшытак з рукапісам, рукапіс | 1954-[1950-я гг.] | 37 | 30 | |
| 95 | Выпіскі А.Я. Адамовіча з кніг М.В. Вішняка "Два пути. Февраль и Октябрь" (1931) і І.Р. Эрэнбурга "День второй" (1934), "Постановления президиума Исполнительного комитета Коммунистического интернационала" і інш. Сшытак з рукапісам, рукапіс. Выразкі з газет з цытатамі Ф. Гедалы (Ph. Guedalla) і Э.М. Рэмарка і інш. (на англійскай мове) | [1950]-1981 | 87 | 70 | |
| 96 | Бібліяграфічныя выпіскі па беларускай гісторыі і літаратуры і інш. Рукапіс А.Я. Адамовіча | [1950-я гг.]-[1983] | 8 | 8 | |
| | * * * | | | | |
| 97 | Пісьмо У.М. Боева (Літва) да рэдактара газеты "Раніца" С. Грынкевіча-малодшага (Германія) наконт публікацыі яго артыкула і з святочнымі віншаваннямі | 1943 | 1 | 1 | |

## 6. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 98 | Фатаграфіі "візітныя" (2) і кабінет-партрэт А.Я. Адамовіча.<br>Адна зроблена ў фотасалоне Р. Міранскага (Мінск) | 1912 | 3 | 3 | |
| 99 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча, індывідуальныя, у час навучання ў Беларускім педагагічным тэхнікуме ў Мінску, у час ссылкі ў Глазаве (Расія) і інш. | 1924-[1940-я гг.] | 9 | 9 | |
| 100 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча, індывідуальныя, у час працы ў Інстытуце вывучэння гісторыі і культуры СССР (Германія), на "Радыё Свабода" ў Нью-Ёрку, у доме састарэлых у Нью-Ёрку і інш. (ЗША) | 1950-1990 | 11 | 11 | |
| 101 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча, індывідуальныя, у час выступленняў на "Byelorussian Study Weekend" ("Уікендзе беларускіх даследаванняў") і XII з'ездзе беларусаў Паўночнай Амерыкі і інш. (ЗША, Канада) | [1950-я - 1980-я гг.] | 16 | 15 | |
| | * * * | | | | |
| 102 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групах з Аляксандрам (айчымам) і Палінай (маці) Івашкевічамі, Наталляй Шыляевай (жонкай) і кузінай Галінай | 1916-[1940] | 7 | 7 | |
| 103 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групах з [аднакурснікамі ў час навучання ў Беларускім педагагічным тэхнікуме імя Усевалада Ігнатоўскага] і інш. (пач.-сяр. 1920-х гг.).<br>Копія фатаграфіі А.Я. Адамовіча з іншымі сябрамі літаратурнага згуртавання "Узвышша": А.А. Бабарэкам, П.Ф. Глебкам, У.М. Дубоўкам, Т.Т. Кляшторным, К. Крапівой, М. Лужаніным і інш. (1927) з рэтушшу на месцы партрэта З. Бядулі, нанесенай у часы нямецкай акупацыі | | 3 | 3 | |
| 104 | Фатаграфія А.Я. Адамовіча ў групах з Наталляй Арсенневай, Уладзіславам Казлоўскім, Уладзімірам Кушалем, Язэпам Найдзюком, Міколам Шчагловым (Куліковічам) і інш. у рэдакцыі "Беларускай газеты" і "Голасу вёскі" і інш. у Мінску | 1942-1943 | 3 | 3 | |
| 105 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групе з Аляксеем Вініцкім, Леанідам Галяком, Сымонам Кабышам (Кандыбовічам), Віталем Кажаном, Аўгенам Каханоўскім (Калубовічам), Міколам Кунцэвічам, Францам Кушалем і Гіпалітам Паланевічам у Разэнгайме; з Уладзімірам Дудзіцкім (Гуцькам), Ніканорам Ляўковічам, Алесем Марговічам, Станіславам Станкевічам, Пятром Сычом, Паўлам Урбанам і інш. у час ад'езду А.Я. Адамовіча з Мюнхена пасля ўдзелу ў канферэнцыі Інстытута | 1950-1956 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | вывучэння гісторыі і культуры СССР (Германія) | | | | |
| 106 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групах з Паўло і Юліяй Андрусішынымі, Наталляй Арсенневай, Аляксеем Вініцкім, Аўгенам Вярбіцкім, Язэпам Гладкім, Вольгай і Янкам Запруднікамі, Янінай Каханоўскай, Францам Кушалем, Кастусём Мерляком, Галінай Руднік, Янкам Станкевічам, Вітаўтам Тумашам, Міхаілам Урбановічам, Эміліяй Шабуняй, Антонам Шукелойцем, Янкам Юхнаўцом і інш. | [пач. 1950-х-сяр. 1990-х гг.] | 19 | 19 | |
| 107 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групах з Раісай Жук-Грышкевіч, Аляксандрам Лашуком, Аляксандрам Надсанам, Чаславам Сіповічам і інш. у Беларускай бібліятэцы імя Францыска Скарыны і садзе Беларускага дому ў Лондане (Вялікабрытанія) | 1956 - [1980-я гг.] | 3 | 3 | |
| 108 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групах з Алесем Барскім (Баршчэўскім), Янкам Запруднікам, Янінай Каханоўскай і інш. у час выступленняў у Фундацыі Пётры Крэчэўскага, беларускай рэдакцыі "Радыё Свабода" ў Нью-Ёрку і інш. (ЗША) | 1956 - [1980-я гг.] | 8 | 8 | |
| 109 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групах з неўстаноўленымі асобамі у час плавання на пасажырскім лайнеры "Queen Elizabeth" | [1950-я - 1960-я гг.] | 6 | 6 | |
| 110 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групах з Ларысай і Паўлам Урбанамі і інш. у час сумесных адпачынкаў (Германія) | 1969-1971 | 9 | 9 | |
| 111 | Фатаграфіі А.Я. Адамовіча ў групах з Вольгай Арэхвай, Барысам Плескачом, украінскім паэтам Ярам Славутычам (Р.М. Жучэнкам) і інш. на вечары паэзіі Наталлі Арсенневай у Атаўскім універсітэце (Канада). Копіі | 1975 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 112 | Фатаграфіі з пахавання А.Я. Адамовіча на могілках парафіі Святой Жыровіцкай Божай Маці ў Нью-Брансуіку з прысутнымі Васілём Андраюком, Надзяй і Янкам Запруднікамі, Вітаўтам Кіпелем, Сяргеем Навумчыкам, Алай Орса-Рамана, Адольфам Суботай, Антонам Шукелойцем і інш. | 16 чэрвеня 1998 г. | 15 | 15 | |
| | * * * | | | | |
| 113 | Фатаграфіі сяброў і знаёмых А.Я. Адамовіча: | 1930-1953 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | старэйшых дзяцей Алеся Салаўя (Аўстралія), кампазітара Алеся Спаскага, скрыпачкі Алы Федаровіч і інш. (Беларусь). Арыгіналы і копія. Дзве - з дароўнымі надпісамі | | | | |
| | * * * | | | | |
| 114 | Фатаграфіі дома ў Глазаве (Расія), дзе ў 1930-1934 гг. А.Я. Адамовіч адбываў ссылку, і дома ў Мінску, дзе ён жыў у 1943 г. | 1932-1943 | 5 | 5 | |
| | **7. ДАКУМЕНТЫ ЧЛЕНАЎ СЯМ'І А.Я. АДАМОВІЧА** | | | | |
| 115 | Дакументы аб пераездзе бацькоў А.Я. Адамовіча - Аляксандра і Паўліны Івашкевічаў - з Германіі ў ЗША (афідавіт Янкі Станкевіча для пераезду, гарантыі спонсара пераезду - Фелікса Кісяля, тэлеграмы і пісьмы Сусветнай царкоўнай службы (Church World Service) да А.Я. Адамовіча і Ф. Кісяля (5), Міжнароднага камітэта бежанцаў да А.Я. Адамовіча і інш. па пытанні пераезду Івашкевічаў) (на англійскай мове) | 1949-1950 | 17 | 16 | |
| 116 | Пасведчанне Іміграцыйнай і натуралізацыйнай службы ЗША на імя Паўліны Івашкевіч з яе фатаграфіяй (на англійскай мове) (ЗША). Развітальнае слова з П. Івашкевіч (машынапіс) і яе памінальныя карткі ("клепсідры") і інш. (на англійскай, беларускай і польскай мовах). Дакументы аб арганізацыі пахавання П. Івашкевіч, усталявання ёй надмагільнага помніка і інш. (на англійскай мове) | 1950-1959 | 14 | 13 | |
| | * * * | | | | |
| 117 | Візітныя фатаграфіі і фота на дакументы родных А.Я. Адамовіча: Аляксандра Івашкевіча (айчыма), індывідуальныя (9) і ў групах з маці, сёстрамі і зяцем, Паўліны Івашкевіч (маці), індывідуальныя (5) і з сястрой. Некаторыя зроблены ў фотасалонах братоў Элы і Янкеля Берманаў і Ізраіля Метара (Мінск) | [пач. XX ст.] - [1950-я гг.] | 21 | 21 | |
| 118 | Фатаграфіі блізкіх А.Я. Адамовіча: Наталлі Шыляевай (жонкі) (2), [цёткі Алены], кузіны Галіны, індывідуальныя (2) і з мужам і сынам, брата Уладзіміра. 4 з іх з дароўным надпісам. Фатаграфіі неўстаноўленых сваячак А.Я. Адамовіча, зробленыя ў фотасалонах | [пач. XX ст.] - 1940 | 10 | 10 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | [Н.Н.] Мікіцкага, Р. Міранскага і Л. Эпштэйна (Мінск) | | | | |
| **8.** | **ДАКУМЕНТЫ А.Я. АДАМОВІЧА, ПЕРАДАДЗЕНЫЯ З НАЦЫЯНАЛЬНАГА АРХІВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У БДАМЛМ** | | | | |
| 119 | Пісьмы Н.А. Шыляевай (жонкі) А.Я. Адамовічу (Расія).<br>Л. 46 - пагрудны сілуэт Н.А. Шыляевай (выцінанка, чорная папера) | 1938-1939 | 131 | 41 | |
| 120 | Пісьмы Н.А. Шыляевай (54) і яе маці (2) А.Я. Адамовічу (Расія).<br>Л. 40 - фатаграфія Н.А. Шыляевай | 1940 | 159 | 57 | |
| 121 | Пісьмы Н.А. Шыляевай А.Я. Адамовічу (Расія) | 1941 | 72 | 22 | |
| 122 | Пісьмы Ф. Аляхновіча і Я. Найдзюка (Вільня), Я. Станкевіча (Варшава), І.А. Ермачэнкі (Прага) і інш. А.Я. Адамовічу.<br>Расклады лекцый выкладчыка А.Я. Адамовіча на курсах настаўнікаў у Мінску.<br>Пасведчанні, пропускі, запрашальныя білеты і інш. Беларускай народнай самапомачы, Мінскага гарадскога тэатра і інш. на імя А.Я. Адамовіча.<br>Фатаграфіі К.Б. Езавітава (3) (дзве - з дароўнымі надпісамі А.Я. Адамовічу).<br>Лл. 25, 27 - пісьмы часопіса "Вестник Знания" (Ленінград) і Рускага таварыства мовы іда (Масква) (на мове іда) да А.Я. Адамовіча (1925).<br>Лл. 66-71 - фатаграфіі студэнтак з дароўным надпісам А.Я. Адамовічу (1940), А.А. Шыляева (швагры) (2) з дароўным надпісам А.Я. Адамовічу і Н.А. Шыляевай [да 1941 г.] | 1941-1942 | 73 | 24 | |
| 123 | Пісьмо А.Я. Адамовіча (на нямецкай мове) і пісьмы В. Тумаша (2) (Берлін), Беларускага навуковага таварыства (Вільня) і Беларускай народнай самапомачы (Мінск) і інш. А.Я. Адамовічу.<br>Пасведчанні і запрашальныя білеты на імя А.Я. Адамовіча (адно - на імя "Сп. Сянкевіча") (на беларускай і нямецкай мовах) | 1942 | 29 | 15 | |
| 124 | Пісьмы Ф. Аляхновіча (Вільня), В. Тумаша (2) і А. Шкуцькі (Шкутко) (2) (Берлін), Беларускай народнай самапомачы, аддзела культуры і асветы і аддзела мастацтваў Мінскага гарадскога камісарыята і інш. А.Я. Адамовічу.<br>Запрашальныя білеты і інш. Беларускага навуковага таварыства (Вільня), Беларускай народнай самапомачы, Мінскага гарадскога тэатра і | 1943 | 40 | 23 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | інш. на імя А.Я. Адамовіча (два - на імя Н.А. Арсенневай і У. Казлоўскага) | | | | |
| 125 | "Автобиография Адамовича А.Е." (машынапіс). Лл. 96-100 - характарыстыкі А.Я. Адамовіча неўстаноўленых асоб (машынапіс з паметамі і праўкай) [1941-1943 гг.] | 1935 | 102 | 3 | |
| 126 | Вопіс НАРБ на дакументы А.Я. Адамовіча за 1935, 1938-1943 гг., перададзеныя ў БДАМЛМ | 1963 | 4 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 126 (сто дваццаць шэсць)
спраў з № 1 па № 126 , 927 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла

вяд. архівіст ______________________ В.Ф. Шаталава

2021

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння ______________________ В.І. Бярэйшык

захаванасці дакументаў ______________________

"_____"____________20____ г.